Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

# ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

ОРГАН ПАРТКОМА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА.

Год выдання II
№ 12 (24)
2 ліпеня
1936 года.

Адрас рэдакцыі:
Менск,
Універсітэцкі гарадок,
біякорпус.

## Горача вітаем дэкрэт урада аб выпуску новай пазыкі

Радыё перадала радасную вестку. Урад выдаў дэкрэт аб выпуску новай пазыкі. Увечары першага ліпеня на ўсіх факультэтах адбыліся мітынгі студэнтаў і навуковых работнікаў універсітэта. Студэнты, навуковыя работнікі і тэхнічны нерсанал БДУ горача вітаюць дэкрэт урада аб выпуску новай пазыкі. Адразу пасля мітынгаў на ўсіх факультэтах разгарнулася падпіска. Студэнты падпісваюцца на новую пазыку на адну трэць месячнай стыпендыі.

Студэнты абавязаліся ў час летніх канікул праводзіць масавую работу, па распаўсюджванню пазыкі сярод насельніцтва.

## ВУЧЭБНЫ ГОД ЗАКОНЧЫЎСЯ

Апусцелі аудыторыі і лабараторыі. Карыдоры вучэбных карпусоў не напаўняюцца стогалосым шумам у час перапынкаў. У бібліятэцы сядзяць адзінокія фігуры студэнтаў, зайшоўшых сюды пачытаць газету ці часопіс. Вучэбны год закончыўся. У кожнага студэнта залікавая кніжка на руках, і у ёй ацэнка яго вучобы за год.

Прайшоўшы вучэбны год быў напоўнен як для студэнтаў, так і выкладчыкаў упартай работай. Атрымаць выдатную адзнаку — быць выдатнікам вучобы — мэта кожнага студэнта.

У выніку залікоавай сесіі мы маем значнае павелічэнне ліку выдатнікаў. Калі ў першым наўгоддзі было выдатнікаў 19 чалавек, то зараз 37 чал. Трэба адзначыць, што ацэнка «выдатна» давалася пры значна павышаных запатрабаваннях да студэнтаў.

Адзнака «дрэнна» на паасобных факультэтах зведена да мінімуму: гістфак 0,6 процанта, біяфак 0,8 процантаў. Наша задача ў будучым навучальным годзе адзнаку «дрэнна» ліквідаваць зусім.

На факультэтах процант выдатнікаў вызначаецца наступнымі лічбамі: хімфак 8,5 процантаў, гістфак 4, фізмат 3,5, геафак 4, біяфак 5,7.

Гэтыя дасягненні атрыманы таму, што пры правільным кіраўніцтве з боку нашай партарганізацыі і рэктарыята, прафесарска-выкладчыцкі склад, студэнты працавалі не пакладая рук.

Трэба адзначыць работу прафесароў: Бурстына, Дыдырка, Пятосіна, Змачынскага, Казлова, Нікіфарава, Перцава, Шчэрбакова, Годнева, Чурына. Дацэнтаў: Зубковіча, Некрашэвіча, Нахімоўскай і др.

Нельга абыйсці і тых недахопаў, якія меліся ў нас на працягу навучальнага года: гэта незабяспечанасць нскаторых факультэтаў поўнасцю кваліфікаванымі выкладчыкамі (гістфак, геафак), незабяспечанасць поўнасцю неабходнымі дапаможнікамі і падручнікамі, слабае ўцягненне ў навукова-даследчую работу студэнтаў і т. д. Гэтыя недахоны ў будучым навучальным годзе павінны быць знішчаны, гэтага патрабуе ад нас апошняя пастанова партыі і ўрада аб вышэйшай школе.

Сёння мы выпускаем з сваіх сцен 143 чалавек, закончыўшых курс навучання ва універсітэце. За 4 гады яны добра авалодалі навукован, многія з іх на «выдатна» абаранілі свае дыпломныя работы (Жухавіцкі, Маніс, Кучарава, Старобінец, Харамоненко, Камісарук, Латоцкая, Рыукін, Партная і др.); «мы на «выдатна» справімся і з практычнай работай», заявілі выпускнікі.

Гістарычная пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб вышэйшай школе дае нам яшчэ большы стымул у рабоце. Гэта пастанова яшчэ раз яскрава нам паказвае сталінскія клопаты аб кадрах, аб людзях.

Толькі дзякуючы таму, што намі кіруе комуністычная партыя і наш дарагі тав. Сталін, у нашай краіне забяспечана такая шырокая магчымасць вучыцца і працаваць на карысць соцыялізма.



Каля біялагічнага корпуса.

## ГІСТАРЫЧНАЯ ПАСТАНОВА

Пастанова ЦК і СНК «Аб рабоце вышэйшых навучальных устаноў і аб кіраўніцтве вышэйшай школай» з'яўляецца вынікам выключнай увагі і клопатаў з боку нашай партыі, урада і асабіста таварыша Сталіна аб кадрах. Рэалізацыя гэтага важнейшага дакумента забяспечыць падрыхтоўку высокаякасных, поўнасцю аўладаўшых сваей справай кадраў, здольных усе свае сілы і веды аддаць на карысць соцыялістычнага будаўніцтва. Падводзячы вынікі чатырохгадовага навучання ва ўніверсітэце, я з задавальненнем адзначаю, што тыя веды, якія патрэбны для практычнай работы, мною набыты і абавязуюся апраўдаць высокае званне совецкага спецыяліста.

Нельга не адзначыць і тыя недахопы, якія мелі месца на працягу нашага навучання ва ўніверсітэце. Да недахопаў трэба аднесці адсутнасць стабільных праграм, дрэннае выкладанне замежных моў, асабліва на 1-х курсах. У будучым гэтыя недахопы будуць знішчаны на аснове пастановы нашай партыі і ўрада.

Мы, выпускнікі, асабліва ўдзячны партыі і ўраду і асабіста таварышу Сталіну за магчымасць вучыцца, за светлае і радаснае жыццё.

**Студэнт-выпускнік хімфака ХАРАМОНЕНКА С.**

## УЗНІМЕМ ЯКАСЦЬ НАШАЙ РАБОТЫ

Пастанова нашай партыі і ўрада аб вышэйшай школе ад 23-га чэрвеня 1936 г. дае ясныя ўстаноўкі па ўсіх асноўных пытаннях арганізацыі і работы вышэйшай школы. Тут мала слоў, але ўсё ёсць. Кожнаму, хто мае дачыненне да вышэйшой школы, пастанова ўказвае шлях сапраўднага развіцця вышэйшай школы, указвае канкрэтна, што ён павінен рабіць.

На грунце гэтай пастановы павінна разгарнуцца барацьба за якасць падрыхтоўкі нашых кадраў. Адзіным адказам на гэту пастанову з боку кожнага навуковага работніка павінна з'явіцца павышэнне якасці яго ўласнай, як педагагічнай, так і навуковай работы.

**Прафесар ПЯТОСІН.**

## ЗА ДЫПЛОМ ПЕРШАЙ СТУПЕНІ

1934 год. Першы дзень верасня. Сонечная асенняя раніца. У адчыненае акно павеяла цеплае паветра з пахам спелых яблык, сліў, напамінаючы нядаўна пакінутую вёску.

«Сёння заняткі ва ўніверсітэце», — падумаў Нікалай. Яму не верылася, што гэтая, так даўно жаданая, так доўга чаканая думка здзейснілася. Але, разам з радасцю, сэрца хвалявала нейкая трывога: «Як спраўлюся з вучобай? Гістарычныя навукі не лёгкія: трэба многа і ўпарта чытаць, многа працаваць, каб разабрацца ў гістарычным матэрыяле. Горш усяго быць адстаючым... Буду ўпарта працаваць — будуць добрыя вынікі».

З такімі думкамі і імкненнямі П. Пятровіч прышоў на 1 курс гістарычнага факультэта. З першай-жа лекцыі ён уважліва слухаў прафесара, старанна вёў канспект, імкнуўся мысліць разам з прафесарам, схапіць асноўнае ў лекцыі. Указаная прафесарам літаратура рэгулярна ім прапрацоўвалася поўнасцю. Кнігі расшыралі кругазор ведаў, дапаўнялі лекцыі. З першых-жа дзён вучобы ва універсітэце ён імкнуўся як можна лепш выкарыстаць час, каб ніводная мінута не прапала дарэмна. Прышлося, бясспрэчна, сустрэцца і з некаторымі цяжкасцямі асабліва яны сказаліся на недахопе гістарычнай літаратуры. Але і тут Пятровіч знаходзіў выхад: ім выкарыстоўваліся Дзяржаўная і іншыя гарадскія бібліятэкі.

За ўпартай працай няпрыкметна прайшло першае паўгоддзе. Першыя залікі. Не без хвалявання Пятровіч сеў за залікоавы стол. Гэта-ж праверка поўгадовай працы. Вынікі далёка не задаволілі яго, хаця адзнакі былі «добра» і «выдатна».

«Трэба лепш працаваць», — рашыў Пятровіч.

Другі год вучобы Пятровіч сустрэў больш упэўнена. Быў вопыт работы першага курса. Галоўны упор у сваёй працы ён робіць на самастойную распрацоўку матэрыяла. Ён лепш выкарыстоўвае рабочы час, разам з глыбокім вывучэннем гістарычных навук ён многа чытае і мастацкай літаратуры, актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці універсітэта. Ен вядзе палітшколу, працуе комсоргам групы і разам з гэтым, закончыў другі курс выдатнікам.

Прачытаўшы пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб вышэйшай школе, тав. Пятровіч не без хвалявання гаварыў таварышам:

— Бачыце, як аб нас клапоцяцца наша партыя і урад. Якое-ж права мы маем дрэнна вучыцца? Толькі выдатна. Я бяру курс на дыплом першай ступені.

**Е. ГЕРАСІМАЎ.**

## ВІТАЕМ ПАСТАНОВУ ПАРТЫІ І УРАДА

З вялікай радасцю сустрэлі студэнты і навуковыя работнікі пастанову партыі і ўрада «Аб рабоце вышэйшых навучальных устаноў і аб кіраўніцтве вышэйшай школай».

Дзень 24 чэрвеня быў самы радасны, самы вясёлы для студэнтаў. У пакоі і на дварэ, у бібліятэцы і сталоўцы, па аднаму і групамі студэнты перачытвалі, абгаварвалі, яшчэ і яшчэ раз прадумвалі кожны пункт гэтага важнейшага сталінскага дакумента.

І самае каштоўнае для нас, студэнтаў, гэта раздзелы «Аб арганізацыі вучэбнага часу» і «Аб арганізацыі вучэбнай работы». Новы вучэбны год мы пачнем па сталінскаму ўказанню. У нас не будзе групавых заняткаў, не будзе бескарыснага перажоўвання лекцый, у нас будзе час на самастойную работу, на работу ў лабараторыях, габінетах, бібліятэцы, на кансультацыі; у нас будзе цвёрды расклад і, самае галоўнае, будзе знішчана тая многапрадметнасць, якая мела месца да гэтага часу, будзе адменена існуючая практыка бягучага ўліку паспяховасці студэнтаў, а замест гэтага адзіным крытэрыем будзе экзамен. Мы асабліва вітаем устанаўленне адзнак паспяховасці: «нездавальняюча», «здавальняюча» і «выдатна». Калі раней студэнты большасцю канцэнтраваліся на адзнаку «добра», то цяпер уся ўвага будзе звернута на барацьбу за вучобу на «выдатна», бо студэнт-выдатнік у будучым будзе карыстацца ўсімі перавагамі.

Пастанова СНК і ЦК поўнасцю накіравана на тое, каб нашы вышэйшыя навучальныя ўстановы рыхтавалі высокакваліфікаваных спецыялістаў, усебакова адукаваных, культурных людзей, якія былі-б дастойны нашай эпохі, эпохі вялікага Сталіна.

Наша моладзь, якая будзе канчаць вышэйшыя навучальныя ўстановы, пасля гэтай гістарычнай пастановы не скажа словамі вялікага рускага паэта Пушкіна:

«Мы все учились понемногу
Чему-нибудь и как-нибудь».

Мы будзем вучыцца ўпарта, сур'ёзна і глыбока, разгорнем барацьбу за дыплом першай ступені.

## ПРАДУГЛЕДЖАНА КОЖНАЯ ДЭТАЛЬ

З вялікай цікавасцю азнаёміўся з пастановай ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб рабоце вышэйшых навучальных устаноў і аб кіраўніцтве вышэйшай школай». Чытаючы гэты выключнай важнасці дакумент, яшчэ і яшчэ раз адчуваеш мудрае сталінскае кіраўніцтва ўсімі крокамі нашага жыцця, бязмежныя клопаты любімага правадыра народу, аб людзях, аб кадрах. З вялікай упэўненасцю можна сказаць, што апошняя пастанова паставіць вышэйшую школу на належнае месца.

Возьмем, напрыклад, раздзел пастановы «Аб прыёме ў вышэйшыя навучальныя ўстановы». Мяне, выкладчыка мовы, асабліва радуюць тыя павышаныя патрабаванні па мове, якія прад'яўляюцца зараз да кожнага паступаючага ў ВНУ. Сапраўды, мы павінны прымаць у вышэйшую школу бездакорна граматных, культурных, добра падрыхтаваных людзей. Настаў час, калі такой «прадукцыі» мы можам патрабаваць ад нашай сярэдняй школы.

Але значэнне пастановы не толькі ў гэтым. Яна з'яўляецца разгорнутай праграмай перабудовы ўсёй сістэмы работы ВНУ.

Прыемнае ўражанне выклікае тое, што ў пастанове не абмінуты і такія, на першы погляд, другарадныя пытанні (рамонт і ўборка памяшканняў, культурнае абслугоўванне ля вешалак, у буфетах і сталовых), якія ў агульным комплексе задач барацьбы за павышэнне якасці работы ВНУ, бясспрэчна, адыгрываюць немалаважную ролю. Прадугледжана кожная дэталь!

Наставім-жа перад сабой задачу ўсямерна мабілізавацца на перабудову нашай работы, паводле пастановы ЦК ВКП(б) і СНК БССР, на падрыхтоўку «высокакваліфікаваных спецыялістаў, поўнасцю адказваючых сучасным запатрабаванням соцыялістычнага будаўніцтва».

**Выкладчык беларускай мовы М. ЛЫЧКОЎСКІ.**

—о—

## ПАСЛЯ ЗДАЧЫ ЗАЛІКАЎ



Група студэнтаў-рабфакаўцаў, выпускнікоў.